*На гэтай зямлі, дзе так росна і зорна,*
*Дзе травам буяецца ў сініх лугах,*
*І сэрцу прасторна, і думкам прасторна*
*На бліжніх і дальніх ад дому шляхах.*
*Гады, нібы птушкі ў высокай сінечы,*
*Знікаюць, ні знаку, ні следу няма,*
*Ды ўсё ж распраўляю стамлёныя плечы,*
*Хоць скроні халодзіць адчайна зіма...*



## ЗУБРЫЦКІ ЭДУАРД ІОСІФАВІЧ

Нарадзіўся 17.04.1942 года у в. Шклянцы Бярозкаўскага сельсавета.

Беларускі паэт, журналіст. Скончыў БДУ (1968). Працаваў настаўнікам у Чашніцкім і Верхнядзвінскім раёнах.

З 1971 г. быў супрацоўнікам рэдакцыі верхнядзвінскай раённай газеты «Дзвінская праўда».

Першыя вершы надрукаваў у 1960 г. у часопісе «Маладосць». З гэтага часу яго творы пачалі з'яўляцца таксама ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Работніца і сялянка», рэспубліканскіх і абласных газетах, змяшчаліся ў альманахах «Дзень паэзіі», «Універсітэт паэтычны», «Квадра», «Віцебшчына літаратурная», іншых калектыўных зборніках. Аўтар аповесці «Суэма» (1968), паэмы «Жальба Сар'янскай пушчы» (1993).

У 2001 г. адзін за другім выйшлі новыя зборнікі вершаў нашага земляка : “Сцяблінка баравая”, “Мне б хоць кропельку неба”, “След чмяля”, “Прычашчэнне”, “Рабінавыя астравы”.

У 2011 годзе ў бібліятэцы Саюза пісьменнікаў Беларусі выйшла кніга выбраных твораў Э. Зубрыцкага “Восень над вогнішчам”. На жаль, паэт не дачакаўся выхаду ў свет сваёй кніжкі.

Памёр у маі 2008 года.












## ПРАПАНУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА АЎТАРА

Зубрыцкі Э. І. След чмяля / Э.І. Зубрыцкі. – Мн. : Кнігазбор, 2006

Зубрыцкі Э. І. Мне б хоць кропельку неба / Э.І. Зубрыцкі. – Мн. : Кнігазбор, 2005

Зубрыцкі Э. І. Прычашчэнне / Э.І. Зубрыцкі. – Мн. : Кнігазбор, 2007

Зубрыцкі Э. І. Журлівіца / Э.І. Зубрыцкі. – Мн. : Кнігазбор, 2006

Зубрыцкі Э. І. Сцяблінка баравая / Э.І. Зубрыцкі. – Мн. : Кнігазбор, 2007

Зубрыцкі Э. І. Суэма / Э.І. Зубрыцкі. – Мн. : Кнігазбор, 2008

Зубрыцкі Э. І. Восень над вогнішчам / Э.І. Зубрыцкі. – Мн. : Кнігазбор, 2011

**Докшыцкая цэнтральная бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынга**



# Мне б хоць кропельку неба

**(Да 75-годдзя з дня нараджэння Э. Зубрыцкага)**

**2017 г.**